# Заданні па марфеміцы і словаўтварэнні для высокаматываваных і адораных вучняў

***Багамольнікава Н.А.,***
*дацэнт кафедры педагогікі*
*і прыватных методык,*
*кандыдат філалагічных навук*

Раздзелы “Марфеміка” і “Словаўтварэнне” ў якасці самастойных у агульнаадукацыйных школах не вывучаюцца, а ўключаюцца ў “Марфалогію” як яе падраздзелы, што вывучаюць толькі іх асобныя пытанні. Аднак заданні па адзначаных раздзелах на павышаным узроўні пастаянна задзейнічаны на розных этапах алімпіяды па беларускай мове і літаратуры, таму мэта нашага артыкула – даць паглыбленыя звесткі па “Марфеміцы” і “Словаўтварэнні” і практычна іх замацаваць.

Асноўнай задачай марфемікі з’яўляецца вывучэнне марфемнай структуры слова і яго марфемнага аналізу, сутнасць якога заключаецца ў падзеле слоў на мінімальныя значымыя часткі. А гэта значыць, што пры чляненні на марфемы патрэбна адрозніваць суфіксы *-няк-* і *-н-*, *-як-*; *-нік-* і *-н-*, *-ік-*; *-льнік-* і *-льн-*, *-ік-*. Крытэрыем размежавання служыць падбор роднасных слоў. Калі ў іх аснове суфіксы *-н-*, *-льн-* могуць выступаць самастойна, значыць, у аснове для разбору выяўляюцца два суфіксы. Напрыклад, у словах *дубняк*, *дворнік*, *будзільнік* у наяўнасці суфіксы *-няк-*, *-нік-*, *-льнік*, бо не існуюць словы *дубны*, *дворны*, *будзільны*, а ў аснове слоў *халадзільнік*, *таварняк*, *паскаральнік* гэтыя суфіксы раздзяляюцца (параўн. *халадзіль**н**ая ўстаноўка*, *тавар**н**ы знак*, *паскара**льн**ы працэс*). Патрэбна мець на ўвазе, што *н* можа ўваходзіць і ў склад кораня: *паражн-як*.

Неабходна адрозніваць у складзе слоў прыстаўкі *неда-* і *не-*, *да-*, постфіксы *-ца* і *-цца*. Што тычыцца прыставак, асноўным спосабам размежавання служыць іх семантычнае значэнне. Прыстаўка *неда-* мае значэнне дзеяння, не даведзенага да канца: ***неда**-выканаць*, ***неда**-глядзець* (выканаць не да канца, глядзець не да канца), параўн.: ***не-да**-следаваны* (дзеянне не пачыналася). Постфікс *-цца* выяўляецца ў дзеясловах, якія не маюць адпаведных пар у інфінітыўнай форме з суфіксам *-ць*: *ганары-**цца***, *каласі-**цца*** (адсутнічаюць словы *ганарыць*, *каласіць*, параўн.: *мы-ц-**ца***, існуе інфінітыў *мы-ць).* Аламорфы гэтага постфікса (*аламорфы* – марфемы, якія маюць фанемную блізкасць з тоесным значэннем, але не замяняюць адна другую ў пэўным стнавішчы ў складзе слова, г.з. абумоўлены пазіцыяй гука ў слове) блытаюцца і ў форме дзеясловаў 3-й асобы адз. і мн. ліку. Напрыклад: ён *мы-е-**цца***, *глядз-іц-**ца***, але яны *мы-юц-**ца**, глядз-яц-**ца**.*

Цяжкасці пры падзеле слоў на марфемы выклікаюць з’явы рознага характару, што абумоўлена пэўнымі прычынамі. Да такіх з’яў адносяцца, найперш, гістарычныя: апрошчанне, перараскладанне, ускладненне, дэкарэляцыя. Гэта тлумачыцца тым, што па ходу гістарычнага развіцця роднасныя паміж сабой словы страцілі сутнасць сэнсавых сувязей.

*Апрошчанне* – змяненне, у выніку якога раней вытворная аснова стала невытворнай. Параўн.: лексема *жывот* мела два значэнні:1) частка цела чалавека; 2) жыццё. Яна матывавалася дзеясловам *жыць*, таму мела тры марфемы: *жы-вот-* □. З цягам часу другое значэнне знікла, паміж імі знікла і семантычная сувязь, таму аснова ператварылася ў невытворную: *жывот-*□*.*

*Перараскладанне* – змена ў марфемнай будове слова, пры якой аснова, застаючыся вытворнай, пачынае дзяліцца на марфемы інакш, чым раней (колькасць іх змяншаецца мінімум на адну). У выніку могуць зліваацца ў адну марфему прыстаўкі (*неда-*, *абяз-*/*абяс-*), суфіксы (-*няк*-, -*нік*-, -*льнік*-) самі або разам з коранем, альбо адначасова з коранем аб’ядноўваюцца і прыстаўкі, і суфіксы: ***неда****-гавор-ва-ць* (раней ***не-да****-гавор-ва-ць), выхав-а-****льнік***□ (раней *вы-хав-а-****льн-ік****-*□), *меншав-****ік***□ (раней мен-***ш-авік***□), *сняда-нак*□ (раней ***сн****-яд-****а****-нак*□).

Супрацьлеглая апрошчанню з’ява – *ускладненне*, г.з. раней невытворная аснова становіцца вытворнай. Такі працэс уласцівы ў цэлым запазычаным словам, якія пачынаюць суадносіцца з нядаўна ўтворанымі або існавалі і раней, але не ўспрымаліся як роднасныя. Напрыклад, у слове *лекцыя* сёння выдзяляюць корань ***лекц****-ый-а*, бо ёсць *лект-ар*□, *лекц-ый-н-ы*.

*Дэкарэляцыя* – гэта з’ява, у выніку якой мяняецца характар або значэнне марфем пры захаванні іх колькасці і парадку размяшчэння. Так, у прыслоўях тыпу *зім****ой****, лет****ам****, вечар****амі*** суфіксы паходзяць з канчаткаў склонавых форм назоўнікаў, таму патрэбна ўважліва чытаць кантэкст і правільна вызначыць часціну мовы. Параўн.: *Гэтым лет-****ам*** (канчатак) *мы паедзем адпачываць на мора* і *Лет****ам*** (суфікс) *мы заўсёды адпачываем на моры*.

Цяжкасці пры чляненні марфем могуць быць выкліканы і з’явамі марфаналагічнага характару, асабліва *фузіяй* – зліццём на стыку марфем. Часцей за ўсё фузія адзначаецца на стыку кораня і суфікса (*таксі+іст —> таксіст*□, *студэнт+ств-а —> студэнцтва*), значна радзей сустракаецца на стыку суфіксаў (*тк-ач+ств-а —> ткацтва*) або прыстаўкі і кораня (*рас-сад-а —> расадоа*). У запазычаных словах коранем з’яўляецца ўся аснова, таму назіраюцца выпадкі ўсячэння: *кенгур****(у)****+ов-ы —> кенгуровы*.

Сярод іншых з’яў можна адзначыць: а) выпадзенне гукаў у каранях слоў, што выяўляецца ў супастаўленні з роднаснымі словамі (*вы-гля-ну-ць*, параўн.: *вы-гля****(д)****-ну-ць*); б) “скрадванне” ёта. Літары *е, ё, я, ю, і* ў канкрэтных пазіцыях могуць абазначаць два гукі: [j] + адпаведны галосны [э],

[о], [а], [у], [і]. Пры марфемным аналізе ў межах адной марфемы ёт “скрадваецца” і графічна не паказваецца: *ям-а, ель-ніч-ак*□, *вясёл-ая, медаль-ён*□. На марфемным шве з ётам слова перапісваецца другі раз з адлюстраваннем гукавога абазначэння ётавых літар у скарочанай транскрыпцыі, дзе і праводзіцца падзел на марфемы. Напрыклад: *двое – дв-оj-э, пасеяць – па-сеj -а-ць, вераб’іха – верабj -іх-а*.

Падоўжаныя зычныя ў словах адносяцца да кораня: збожж-а, *калосс-е, уз-бярэжж-а, уз-лесс-е*.

Усе віды марфем, як і значымыя словы ў лексікалогіі, могуць уступаць у сістэмныя сувязі. Так, сярод марфем існуюць: а) аманімічныя, што супадаюць

гучаннем, але адрозніваюцца значэннем (*пад**вод**нік – пера**вод**, цымбал**іст** – ляс**іст**ы, бяг**у** – стал**у***); б) сінанімічныя – марфемы нашай мовы ці іншых моў у складзе нашай , якія маюць аднолькавае ці блізкае значэнне, але генетычна не звязаны паміж сабою (***работ**а – **прац**а, гамяль**чанін** – гомел**ец**, **най**важнейшы – **архі**важны – **звыш**важны)*; в) мнагазначныя – аднолькавымі па гучанні марфемамі абазначаюцца розныя прыметы: *кас**ец*** (назва асобы па дзеянні), *камсамол**ец*** (назва асобы па партыйнай прыналежнасці), *гвардзе**ец*** (назва асобы па сацыяльным становішчы); г) антанімічныя – надаюць словам процілеглае значэнне: ***добр**ы – **дрэн**ны, **над**водны – **пад**водны, галас**ок*** (памяншальнае значэнне) – *галас**ішч**а* (павелічальнае значэнне), *сястр**а** – сёстр**ы**.*

Сінанімічныя марфемы могуць утвараць значны ланцуг слоў. Напрыклад, са значэннем зборнасці выступаюць суфіксы *-ств-/-цтв-* (*студэн**цтв**а*), *-j-* (*звяр'**j**о*), *-няк-* (*бераз**няк***), *-нік-* (*алеш**нік***), *-в-* (*дзят**в**а*), *-ар-* (*дзетв**ар**а*), *-ур-* (*прафес**ур**а*), *-от-/-ат-* (*ліст**от**а*), *-ыj-* (інструментар**ый**), *-н-* (*двор**н**я*), *-ін-* (*садав**ін**а*), *-ік-* (*сімвол**ік**а*), *нулявы суфікс* (*камен**н**ое*).

Заданні па "Марфеміцы".

1. *Вызначце суфіксы ў наступных словах і аргументуйце сваю думку.*

Будаўнік, маркоўнік, кедроўнік, лыжнік, заступнік, грыбнік, чайнік, салатнік, вымяральнік, шукальнік, ачышчальнік, бядняк, маладняк, праснак.

2. *Вызначце, якія змены адбыліся ў структуры наступных слоў*:

Паветра, касынка, абласны, мінскі, верасень, вішняк, няшчасны, ванны (пакой), ружаваты, сініца.

3. *Абвядзіце кружочкам словы, у якіх адбылася фузія афіксаў. Устанавіце, на мяжы якіх афіксаў яна адбылася.*

а) беларускі, віцебскі, сібірскі, смаленскі, матроскі, ліпеньскі, мужыцкі, прэзідэнцкі, гомельскі, арабскі, чумацкі;
б) геройства, невуцтва, ткацтва, майстэрства, выдавецтва, сваяцтва;
в) расхінуць, грузнуць, мокнуць, мінуць, гарнуць, дакінуць, ачнуцца;
г) разгаліна, расада, раздзел, расклеіцца, разява, расол.

4. *Словы падзяліце на марфемы, карыстаючыся, дзе трэба, спрошчанай транскрыпцыяй.*

Аб'інець, жняя, краёвы, давер'е, уз'яднанне, трое, ёдзісты, лаянка, звяр'ё.

5. *Графічная дыктоўка (з захаваннем арфаграфічнага рэжыму).*

*а) наступныя словы запішыце ў выглядзе сімвалічных абазначэнняў марфем:*

выданне, абвестка, еднасць, жартаўнік, здольнасць, ідэальна, двух'ярусны, раўназначнасць, танчэйшы, касабокі, смяяцца і г.д.;

*б) адваротнае заданне: падабраць словы адпаведна іх графічнай будове (настаўнік прапаноўвае схемы, вучні прыводзяць свае прыклады).*

6. *Працягніце ланцужок слоў з сінанімічнымі суфіксамі:*

а) бярэзнік, чалавецтва…

*б) смеласць, дабрыня…*

*в) вучаніца, артыстка…*

7. *Размяркуйце словы па слупках (ці нумарах) з сінанімічнымі (1), антанімічнымі (2), мнагазначнымі (3), аманімічнымі (4) марфемамі, абазначце іх графічна.*

Тут (дрэва), багацей (назоўнік), зімовы, міралюбівы, зімні, восеньскі, горны, чорны, багацей (прыслоўе), тут (прыслоўе), ляснік, соты (назоўнік), сябар, смалісты, асенні, вясновы, соты (лічэбнік), надводны, гарысты, столік, шчаслівец, гарошына, адбегчы, прарэктар, прыбегчы, белы, праміnуць, танкіст, прыяцель, наводчык.

Тэрмін *словаўтварэнне* абазначае розныя лінгвістычныя паняцці, параўн.: “утварэнне новых слоў шляхам спалучэння адна з другой каранёвых і афіксальных марфем, а таксама асноў дадзенай мовы ў розных камбінацыях па пэўных мадэлях, якія ўключаюць правілы чаргавання гукаў, што вызначаюць той ці іншы характар спалучэння” (Ахманава В.С.), “раздзел мовазнаўства, які вывучае структуру слоў і законы іх утварэння” (Разенталь Д.Э., Целянкова М.А.), “галоўны сродак узбагачэння мовы” (Шакун Л.М.) і інш. Ужо гэтых азначэнняў дастаткова, каб усведаміць шматаспектнасць з’явы і шматзначнасць тэрміна. У словаўтварэнні як раздзеле мовазнаўства аб’ектам з’яўляецца: 1) слова, але не ўсякае, як у марфалогіі, і не абавязкова значымае, як у лексікалогіі, а толькі ўтворанае, вытворнае, і не само па сабе, а ва ўзаемасувязі з утваральным, бо кожнаму ўтворанаму слову адпавядае ўтваральнае, напрыкла, *весял**осць*** ад *вясёлы.* 2) Аб’ектам словаўтварэння з’яўляюцца і розныя словаўтваральныя сродкі: словаўтваральныя афіксы, утваральныя асновы, інтэрфіксы і іншыя элементы ў структуры ўтвораных слоў.

Словаўтварэнне мае развітую сістэму сваіх сродкаў і паняццяў, аднак у агульнаадукацыйнай школе асноўная ўвага ўдзяляецца такому яго паняццю, як словаўтваральны аналіз, сутнасць якога заключаецца ва ўстанаўленні трыяды: ад якога слова ўтворана дадзенае, пры дапамозе якога сродку і якім спосабам. Марфемны і словаўтваральны аналізы могуць супадаць і не супадаць, параўн.: *мод-н-ік*□ (падзел на марфемы) і *мод**нік***, матывуецца лексемай *мода* (той, хто сочыць за модай) (несупадзенне) або *мод**нік*** ад *модны* (модна апранаецца) (супадзенне). Гэта з’ява множнай матывацыі. Аднак яна характэрна для невялікай колькасці слоў беларускай мовы.

У заданнях на алімпіядах па беларускай мове задзейнічаны таксама такія паняцці, як *словаўтваральны ланцуг* і *словаўтваральная пара*. Словаўтваральны ланцуг – гэта паняцце, калі адно слова з’яўляецца базай для ўтварэння другога, другое ўтварае трэцяе, трэцяе – чацвёртае і г.д. Напрыклад: *цешыць —> **у**цешыць —> уцеш**лів**ы —> **ня**ўцешлівы.* Адно і тое ж слова можа матываваць некалькі вытворных, утвараючы словаўтваральныя пары. Напрыклад: *брат —> брацік, браток, братка, братаў, братні, брацкі, брацтва, братацца, пабрацім*; *пісаць —> пісьмо, пісец, пісака, напісаць,*

*выпісаць, запісаць* і інш. Вытворныя і невытворныя словы, аб’яднаныя агульным коранем, складаюць *словаўтваральнае гняздо,* якое будуецца наступным чынам:

*бель*
*бел**ізна***          *пабел**ен**ы*
*бял**е**ць*          ↑
*белы*     —>     *бял**і**ць* —> ***па**бяліць* —> *пабел**к**а* —>*пабелач**н**ы*
↓
***за**бяліць*
*бял**як***
*бял**янк**а* —> *бяляна**ч**ка*

Як бачна са схемы, словаўтваральнае гняздо ўключае такія паняцці, як словаўтваральная пара, словаўтваральны ланцуг, утваральная аснова, словаўтваральны сродак, словаўтваральны спосаб. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе вар’іраваць заданні.

Заданні па “Словаўтварэнні”.

1. *Знакам + адзначце правільныя ланцужкі, – няправільныя. У няправільных ланцужках узнавіце ўтваральныя асновы, устанавіце спосаб утварэння.*

Квет – кветка – квецень – кветнік.
Квет – кветнікавы – кветкавы – кветачка.
Чорны – чарнець – пачарнець – пачарнелы.
Хмурыць – нахмурыць – нахмурыцца – нахмураны.
Чорны – чарніць – чарната – чорненькі.
Хмуры – хмурыць – нахмураны – нахмуранасць.
Сыр – сырок – сырковы.
Чорны– чарнаваты – счарнець – счарнелы.
Сыры – сырэць – сырэц – сырцовы.
Сухі – сушыць – засушыць – засуха.

*2. З прыведзеных вышэй прыкладаў (заданне №1) паспрабуйце пабудаваць словаўтваральныя гнёзды і знайсці ў іх словаўтваральныя пары.*

3. *Устанавіце адпаведнасць паміж вытворнымі словамі і спосабам іх утварэння.*

| | |
|---|---|
| А. Што-небудзь | 1. Прыставачны |
| Б. Пераход | 2. Суфіксальны |
| В. Густанаселены | 3. Прыставачна-суфіксальны |
| Г. Звышнатуральны | 4. Нульсуфіксальны |
| Д. Педкаледж | 5. Складанасуфіксальны |
| Е. Прыазёрны | 6. Абрэвіяцыя |
| Ж. Аднакласнік | 7. Асноваскладанне |
| З. Шыфроўка | 8. Постфіксальны |
| | 9. Словаскладанне |

*4. Адзначце правільныя, на вашу думку, сцвярджэнні +, памылковыя –* -
Корань – абавязковая частка кожнага слова.

Слова можа быць утворана пры дапамозе двух суфіксаў.
Усе парадкавыя лічэбнікі з'яўляюцца вытворнымі.
Усе складаныя словы маюць два карані.
Слова можа быць утворана пры дапамозе дзвюх прыставак.
Не заўсёды можна  падабраць да вытворнага слова яго ўтваральнае.
Прыслоўі не маюць постфіксаў.
Канчатак з'яўляецца таксама словаўтваральным сродкам.
Усе словы без афіксаў з'яўляюцца вытворнымі.

*5. Адкажыце на пытанні:*

Якія спосабы адносяцца да немарфемнага і марфемнага словаўтварэння?

Ці маюцца словаўтваральныя сродкі пры немарфемным утварэнні?

Як бачна, заданні выконваюцца на аснове асобных слоў, аднак можна ажыццявіць іх і на базе тэкстацэнтрычнага падыходу. Настаўнік падбірае звязаны тэкст і на яго аснове вар'іруе заданні, што ў ім выяўляюцца.

Мы можам пагадзіцца, што прапанаваныя віды работы з'яўляюцца складанымі, аднак узгадаем словы Суворава А.В.: "Цяжка ў вучэнні – лёгка ў баі".

Літаратура

1. Багамольнікава, Н. А. Марфеміка. Практыкум па сучаснай беларускай мове / Н. А. Багамольнікава. – Гомель, 2000. – 29 с.

2. Шакун, Л. М. Словаўтварэнне / Л. М. Шакун. – Мінск : Вышэйшая школа, 1978. – 128 с.